УДК 069(1-21)(476-25)

# ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНЫЯ МУЗЕІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: КЛАСІФІКАЦЫЙНЫЯ І ТЫПАЛАГІЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ

***І. І. Бамбешка,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Ваенныя падзеі ў гісторыі Беларусі пакінулі значны аб'ём featureзнага роду артэфактаў, для захавання і папулярызацыі якіх ствараюцца ваенна-гістарычныя музеі. Падобныя музеі функцыянуюць у падпарадкаванні розных ведамстваў Рэспублікі Беларусь. Значная іх колькасць дзейнічае ў сістэме Міністэрства культуры. Дадзены артыкул прысвечаны аналізу структуры сеткі ваенна-гістарычных музеяў названага міністэрства, іх разнастайнасці і варыятыўнасці.

**Ключавыя словы:** ваенная гісторыя, Другая сусветная вайна, Вялікая Айчынная вайна, музейная сетка, музеі, ваенна-гістарычныя музеі, мемарыяльныя і гісторыка-культурныя комплексы.

# MILITARY HISTORICAL MUSEUMS OF THE REPUBLIC OF BELARUS: CLASSIFICATION AND TYPOLOGICAL CHARACTERISTICS

***I. Bambeshka,***
*PhD in Culturalogy, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** Military events in the history of Belarus left a significant number of various kinds of artifacts, for the preservation and popularization of which military history museums are being created. Such museums operate under the jurisdiction of various departments of the Republic of Belarus. A significant number of them operate within the system of the Ministry of Culture. This article is devoted to the analysis of the structure of the network of military history museums of the specified ministry, their diversity and variability.

**Keywords:** military history, World War II, Great Patriotic War, museum network, museums, military historical museums, memorial and historical cultural complexes.

Ваенна-гістарычныя музеі – група музеяў гістарычнага профілю, зборы якіх дакументуюць ваенную гісторыю і развіццё ваеннага мастацтва. Названыя музеі здзяйсняюць збор, захаванне і экспанаванне зброі, прадметаў ваеннай тэхнікі, рыштунку, ваенных сцягоў, рэліквій і дакументаў, звязаных з ваеннай гісторыяй, а таксама вядуць навукова-даследчую дзейнасць у адпаведным кірунку [9, с. 103].

Практыка захавання артэфактаў, звязаных з ваеннай гісторыяй, з'явілася ў старажытнай гісторыі. У айчыннай музейнай традыцыі першы вопыт падобнай дзейнасці звязаны з калекцыянерскай дзейнасцю роду Радзівілаў. Крыніцы сведчаць аб акумуляцыі ў Нясвіжскім замку ўзораў зброі, даспехаў вядомых еўрапейскіх майстроў і інш. [4; 7; 6, с. 18]. У XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі ўзнік шэраг прыватных збораў, у якіх помнікі ваеннай гісторыі займалі значнае месца. Можна ўзгадаць ваенна-гістарычныя калекцыі К. П. Тышкевіча (Лагойск), А. Гюнтэра (маёнтак Дабраўляны Віленскай губерні (цяпер Смаргонскі раён Гродзенскай вобл.), Г. Х. Татура (Мінск), В. П. Федаровіча (Віцебск), І. І. Луцкевіча (Вільня), Я. Уняхоўскага (в. Русінавічы Мінскага раёна Мінскай вобл.), В. І. Валадковіча (аг. Іванск Чашніцкага раёна Віцебскай вобл.) і інш. [6, с. 26, 31, 35, 36, 38, 44, 45; 3, с. 29; 1, с. 157; 10, с. 55; 2, с. 108]. Захоўваліся артэфакты ваенна-гістарычнага характару і ў іншых музеях, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі ў акрэслены перыяд. Гэтым калекцыям прысвечана значная колькасць публікацый, таму на іх мы не будзем падрабязна спыняцца.

У міжваенны перыяд узоры зброі, ваеннага рыштунку камплектаваліся ў Беларускім дзяржаўным музеі, яго аддзяленнях у Віцебску і Магілёве і іншых музеях. Аднак па-ранейшаму самастойнага ваенна-гістарычнага музея на тэрыторыі Беларусі не існавала. Больш маштабна праца па стварэнні ваенна-гістарычных музеяў разгарнулася напрыканцы Вялікай Айчыннай вайны [5]. У пасляваенны перыяд на тэрыторыі Беларусі была створана значная колькасць адмысловых ваенна-гістарычных музеяў. Яны ўваходзяць у структуру розных міністэрстваў і ведамстваў Рэспублікі Беларусь: Міністэрства абароны (Дзяржаўны музей гісторыі Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь), Міністэрства адукацыі (школьныя музеі на адпаведную тэматыку), Міністэрства культуры (МК РБ) і інш.

Мы засяродзім нашу ўвагу на музеях у падпарадкаванні МК РБ. Паводле партала museum.by і Рэестра музеяў Рэспублікі Беларусь у сістэме названага міністэрства функцыянуе 23 музеі (14,7% ад агульнай колькасці музеяў МК РБ), якія паводле складу фондавага збору і па тэматыцы экспазіцыі адносяцца да ваенна-гістарычных [8; 11].

У складзе названых музеяў можна вылучыць асобныя групы, карыстаючыся як агульна-музеелагічнай класіфікацыяй і тыпалагізацыяй, так і падзелам ваенна-гістарычных музеяў, які прадстаўлены ў Расійскай музейнай энцыклапедыі. Традыцыйна айчынныя і замежныя (у прыватнасці, расійскія) музеёлагі вылучаюць наступныя крытэрыі для класіфікацыі музеяў: паводле профілю, роду дзейнасці, спосабу рэалізацыі функцыі дакументавання (дамінантнага тыпу захоўваемых у музеі каштоўнасцей), па формах уласнасці, адміністрацыйна-тэрытарыяльным прынцыпе, прававым статусе, па маштабах дзейнасці [12, с. 53; 13, с. 67–68].

Аўтар энцыклапедычнага артыкула пра ваенна-гістарычныя музеі прапануе наступную класіфікацыю ваенна-гістарычных музеяў: музей агульнай ваеннай гісторыі, музеі, звязаныя з асобнымі галінамі ваеннай справы і навукі, а таксама па відах узбраення, родах войск (артылерыйскі, ваенна-марскі, авіяцыйны, ваенна-медыцынскі і інш.), мемарыяльныя музеі, музеі-помнікі і помнікі-ансамблі, музеі-дыярамы і музеі-панарамы, музеі-крэпасці, замкі-крэпасці, музеі гісторыі асобных воінскіх падраздзяленняў (палкавыя музеі, музеі ваенных акруг), музеі ваенна-вучэбных устаноў, музеі-арсеналы, ваенна-гістарычныя музеі-запаведнікі [9, с. 103–104].

Грунтуючыся на згаданых крытэрыях, мы праспрабуем класіфікаваць ваенна-гістарычныя музеі сістэмы МК РБ. У складзе ваенна-гістарычных музеяў можна вылучыць музеі, якія дакументуюць падзеі ваеннай гісторыі комплексна ў шырокіх храналагічных межах. Да такой катэгорыі музеяў можна аднесці Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава, Гомельскі абласны музей ваеннай славы, Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна.

Большая частка (8) вывучаемых ваенна-гістарычных музеяў засяроджвае ўвагу выключна на падзеях Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Гэта і музеі, якія дакументуюць усю вайну комплексна, і тыя, што захоўваюць памяць пра асобныя падзеі на канкрэтнай тэрыторыі, асобныя формы супраціўлення ў час вайны.

У складзе ваенна-гістарычных музеяў МК РБ таксама вылучаецца музей, прысвечаны ваеннаму канфлікту на тэрыторы Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан (1979–1989) – Віцебскі гарадскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Сярод названых музеяў неабходна вылучыць і мемарыяльныя ваенна-гістарычныя музеі, прысвечаныя жыццю вядомых асоб ваеннай гісторыі: Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза Зінаіды Міхайлаўны Тусналобавай-Марчанка, Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза Міная Філіпавіча Шмырова і Музей Героя Савецкага Саюза Мікалая Чэпіка.

Усе ваенна-гістарычныя музеі сістэмы МК РБ адносяцца да ліку навукова-асветніцкіх (масавых) музеяў. Яны арыентаваны на самую шырокую аўдыторыю, іх фонды актыўна выкарыстоўваюцца з культурна-адукацыйнымі мэтамі. На аснове фондавых збораў падобных музеяў, у якіх сканцэнтраваны прадметныя сведчанні працэсаў ваеннай гісторыі, ствараюцца стацыянарныя і часовыя экспазіцыі. Іх галоўная задача – праз экспазіцыйную дзейнасць, розныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці комплексна актуалізаваць ваенна-гістарычную спадчыну рэспублікі.

Сярод аналізуемых намі ваенна-гістарычных музеяў можна вылучыць як калекцыйныя, так і ансамблевыя. Большасць музеяў – музеі калекцыйнага тыпу, якія функцыянуюць на падставе рухомых калекцый музейных прадметаў. Да ансамблевых можна аднесці Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» і Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь». Важна адзначыць, што гэтая класіфікацыя ў пэўнай ступені носіць умоўны характар, паколькі многія музеі размешчаны ў помніках архітэктуры, што захоўваюцца ў гістарычнай недатыкальнасці, а музеі ансамблевыя, разам з захаваннем архітэктурнага ансамбля, камплектуюць фондавыя зборы ваенна-гістарычнага характару. Дадзены класіфікацыйны падзел ускладняецца яшчэ і тым, што ў складзе шэрагу ваенна-гістарычных музеяў калекцыйнага характару функцыянуюць адпаведныя гісторыка-культурныя ці мемарыяльныя комплексы ці асобныя помнікі. Так, філіялам Ушацкага музея народнай славы імя Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Елісеевіча Лабанка з'яўляецца Мемарыяльны комплекс «Прарыў», у складзе БДМВАв – Ваенна-гістарычны комплекс «Старая мяжа» (Мінская вобл., Дзяржынскі раён, п. Станькава), Помнік воінам-інтэрнацыяналістам (г. Мінск) і г. д. У сваю чаргу Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» уяўляе сабой складанае музейна-помнікавае ўтварэнне: гэта традыцыйныя музеі калекцыйнага тыпу (Музей абароны Брэсцкай крэпасці, Музей «5 форт»), размешчаныя на тэрыторыі ўнікальнага фартыфікацыйнага збудавання, у сукупнасці са скульптурнымі кампазіцыямі.

Па адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыкмеце ў складзе аналізуемых музеяў вылучаюць музеі рэспубліканскага падпарадкавання (БДМГВАв і Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-

герой» разам з філіяламі), абласнога (6 музеяў), раённага (9 музеяў) і гарадскога (4 музеі) падпарадкавання.

Падзел па прававым статусе вызначае месца музея ў іерархіі музейнай сеткі, акрэслівае яго правы і абавязкі. Паводле названай катэгорыі ў складзе разглядаемых ваенна-гістарычных музеяў можна вылучыць галаўныя і філіялы. Большасць музеяў (13) уяўляюць сабой галаўныя музеі і 10 дзейнічаюць як філіялы.

Ваенна-гістарычная тэматыка, асабліва падзеі Вялікай Айчыннай вайны, знайшлі адлюстраванне ў экспазіцыі практычна ўсіх музеяў рэспублікі (за рэдкім выключэннем). У шэрагу выпадкаў у структуры музеяў дзейнічаюць самастойныя аддзелы і экспазіцыі, прысвечаныя адпаведнай тэматыцы. Так, у складзе Віцебскага абласнога краязнаўчага музея функцыянуе ўнікальная экспазіцыя «Памяці патрыётаў Віцебшчыны 1941–1945», размешчаная ў падвалах былой турмы СД – 9. Самастойныя экспазіцыі ваенна-гістарычнай тэматыкі дзейнічаюць у Пухавіцкім раённым краязнаўчым музеі (раздзелы экспазіцыі «Героі і подзвігі» і «Партызанская Слава»). Яшчэ ў 1989 г. у вёсцы Навасёлкі Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці ў хаце ўдзельніка партызанскага руху ў гады польска-савецкай (1919–1921) і Вялікай Айчыннай войнаў на тэрыторыі Беларусі В. І. Талаша быў адкрыты музей, які ў 2014 г. стаў часткай Петрыкаўскага гісторыка-краязнаўчага музея. І такіх прыкладаў даволі шмат.

Нельга абысці ўвагай і практыку стварэння гісторыка-культурных і мемарыяльных комплексаў, узведзеных для ўшанавання памяці аб трагічных падзеях Вялікай Айчыннай вайны, якія ўласна музеямі не з’яўляюцца. У якасці філіялаў музеяў функцыянуюць мемарыяльныя комплекс «Шунеўка» (Бягомльскі музей народнай славы), «Курган славы» і «Дальва» (Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь»), «Прарыў» (Ушацкі музей народнай славы імя Героя Савецкага Саюза У. Е. Лабанка) і іншыя, якія з’явіліся ў выніку сумеснай працы гісторыкаў, архітэктараў і скульптараў у працэсе маштабнай работы па ўшанаванні падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Невялікія памеры артыкула не дазваляюць даць шырокую і падрабязную характарыстыку названых музеяў. Таму, падводзячы вынік, адзначым, што ў Беларусі на падставе шматгадовага вопыту захавання помнікаў ваеннай гісторыі склалася шырокая сетка ваенна-гістарычных музеяў (23 музеі і філіялы). У адпаведнасці з тэматыкай яны ў большасці сваёй дакументуюць падзеі Другой сусветнай і Вялікай Айчынных войнаў і створаны ў пасляваенны

перыяд. На жаль, многія ваенныя падзеі, якія пакінулі ў айчыннай гісторыі глыбокі і трагічны след (Паўночная вайна, вайна 1812 года, Першая сусветная вайна і інш.), не знайшлі ўвасаблення ў самастойных музеях. Ваенна-гістарычныя музеі можна класіфікаваць па шэрагу ўстойлівых прыкмет: па тэме, форме ўласнасці, ролі ў структуры музейнай сеткі, спосабах дакументавання рэальнасці і г. д. Паралельна ў складзе музеяў сістэмы МК РБ функцыянуюць самастойныя аддзелы, мемарыяльныя архітэктурныя комплексы, якія створаны для захавання памяці аб ваенных падзеях.

1. *Бамбешка, І. І.* Прыватны сядзібны збор Тышкевічаў у Лагойску / І. І. Бамбешка // Рэпрэзентацыя і музеефікацыя творчай спадчыны Тышкевічаў у Беларусі і Літве : Пятыя міжнар. Тышкев. чытанні, Мінск, Крэцінга, 14–15 мая 2014 г. : манаграф. зб. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, Kretingos muzejus grafu Tiskevicu dvare. – Мінск, 2014. – С. 153–161.

2. *Бамбешка, І. І.* Фарміраванне прыватных калекцый на Віцебшчыне ў канцы XVIII – пачатку XX ст. / І. І. Бамбешка // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навук. канф., 20–21 кастр. 2011 г., 14–15 лістап. 2012 г., г. Віцебск / рэдкал.: Г. У. Савіцкі, В. А. Шышанаў, Н. Ю. Шаркоўская. – Мінск, 2013. – С. 106–110.

3. *Бамбешка, І. І.* Фарміраванне прыватных калекцый на тэрыторыі Гродзеншчыны (канец XVIII – пачатак XX ст.) / І. І. Бамбешка // Чацвёртыя Тышкев. чытанні (г. Валожын, 24 кастр. 2012 г.) : матэрыялы чытанняў / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2012. – С. 23–37.

4. *Бохан, Ю. М.* Асаблівасці фарміравання Нясвіжскага арсенала князёў Радзівілаў у XVI ст.: гісторыя і даследаванні / Ю. М. Бохан // Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя даследаванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый : матэрыялы 1-й Міжнар. навук.-практ. канф., Нясвіж, 20 кастр. 2009 г. / рэдкал.: В. А. Сталярчук (гал. рэд.) [і інш.]. – Нясвіж, 2010. – С. 56–62.

5. *Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1941–1991) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2004. – 218 с.

6. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2001. – 109, [2] с.

7. *Егорейченко, С. А.* История коллекции оружия и доспехов рода Радзивиллов из арсенала Несвижского дворца в первой половине XX века [Электронный ресурс] / С. А. Егорейченко // Война и оружие. Новые исследования и материалы : труды Третьей междунар. науч.-практ. конф., 18–20 мая 2016 г. : [в 5 ч.] / [науч. ред. С. В. Ефимов]. – СПб., 2016. – С. 284–296. – Режим доступа: https://avidreaders.ru/download/voyna-i-oruzhie-novye-issledovaniya-i-2.html?f=pdf. – Дата доступа: 22.03.2022.

*8.* Каталог музеяў [Электронны рэсурс] // Museum.by. – Рэжым доступу: http://museum.by/catalog. – Дата доступу: 10.04.2024.

*9. Лагутина, Е. И.* Военно-исторические музеи / Е. И. Лагутина // Рос. музей. энцикл. : в 2 т. – М., 2001. – Т. 1. – С. 103–107.

*10. Півавар, М. В.* Музеі Віцебска ў XIX – пачатку XX ст. / М. В. Півавар // Искусство и культура. – 2012. – № 2 (6). – С. 53–59.

*11.* Рэестр музеяў (на 04.03.2024) [Электронны рэсурс] // Музейны фонд Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу: http://cdn.dkmf.by/RegisterOfMuseums.pdf. – Дата доступу: 11.04.2024.

*12.* Словарь актуальных музейных терминов // Музеи. – 2009. – № 5. – С. 47–68.

*13.* Словарь музейных терминов / М-во культуры Рос. Федерации, ФГУК «Гос. центр. музей соврем. истории России». – 2-е изд., перераб., доп. и испр. – М. : ГЦМСИР, 2010. – 229 с. – (Музейное дело ; вып. 31).